

Фота аўтаркі

# Вікторыя Багдановіч

мастачка і фатограф, выпускніца мастацкага каледжа ім. Ахрэмчыка, студэнтка бакалаўрскай праграмы ЕГУ «Візуальны дызайн», удзельніца міжнародных выстаў і мастацкіх рэзідэнцый. Працуе з аналагавай фатаграфіяй, інсталяцыяй, жывапісам.

# Эган Шыле і я

Вікторыя Багдановіч

# Egon Schiele and I

*Я бачыў некалі каляровы малюнак. У вялікай залі рэстарацыі сядзяць добра ўбраныя людзі, пераважна мужчыны. Пасярод залі танчыць голая жанчына, прыкрываючыся толькі страусіным пяром. Але ўсе мужчынскія галовы звернуты не да танцоркі, але да аднаго са столікаў, дзе кабета, якая сядзіць на крэсле, узняла трохі спадніцу і папраўляе на сцягне зашпількі, якія трымаюць панчохі.*

С. Пясецкі, *Жыццё раззброенага чалавека*

The visual cycle of EHU student Victoria Bahdanovich presents an experience of (photo)graphic interpretation of works of the famous Austrian artist Egon Schiele. Her appeal to the creative heritage of Schiele is an attempt to reflect on the artist's own creative and life experience (including detention!) considering the context of dramatic events taking place in Belarus since August 2020. The cycle was prepared even before the start of the war in Ukraine, but the roll call of epochs frighteningly caught up with the author's intention.

Пачаўшы з панчох, да якіх і я, і Эган Шыле маем яўную сімпатыю, я прапаную вашаму позірку саслізнуць з павязкі на сцягне проста ў бездань, у якую звычайна імкнёмся не глядзець.

Закрэсліваючы нешта, цэнзура акцэнтуе на гэтым нашу ўвагу. Яе мэта – не схаваць нешта, але паказаць, чаго рабіць нельга. Таму гэта наадварот мусіць быць добра бачна! І тады чалавек заўсёды жыве побач з тым, чаго павінен асцерагацца, «удзячны» сістэме за магчымасць займацца гэтым употай, у цемры свайго пакоя. Менавіта дзеля прыстойнасці ўсё непрыстойнае пакрыта фігавым лістком і наўмысна не схаванае цалкам, каб чалавек не забываў пра частку жыцця, якая па-за законам.



Усе фотаінтэрпрэтацыі прац Шыле – Вікторыя Багдановіч

Свабодныя незалежныя людзі, не скаваныя сістэмай і ідэалогіяй – рэдкая парода, якую або адстрэльваюць, або саджаюць у заапарк. На кантрасце з тысячамі зняволеных я адчуваю свабоду. Але гэта не вельмі добры сімптом, калі чалавек пазнае ўсё на кантрасце. Нешта падобнае з экстрэмізмам. Забараняючы Тэлеграм-каналы, нам хочуць давесці, што гэта і ёсць рэальнае зло. Калі няма ворагаў, іх трэба стварыць, абгрунтоўваючы неабходнасць карнай сістэмы. На жаль, зняволеныя цалкам рэальныя, у адрозненне ад злачынстваў, якія ім прыпісваюць.

Такім жа чынам працуе цэнзура ў Фэйсбуку ды Інстаграме. Яна толькі на руку порнаіндустрыі. Іранічна, бо каб Інстаграм «дазволіў» мае здымкі, іх трэба было пакрываць фрагментамі карцін Шыле – менавіта тымі, якія дасюль цэнзуруюць.

Калі вам цікавае маё меркаванне, пра сексуальны запал кажуць вочы, рот і рукі, а не тое, што любяць заклейваць цэнзары. Звярніце ўвагу на позірк мадэляў Эгана, ад якога не адарвацца. Напэўна, такі позірк з'яўляецца, калі ты пачынаеш кахаць. Мне здаецца, самадастатковага і адэкватнага чалавека не ўзбудзяць палавыя органы буйным планам, тым больш такі чалавек не будзе маляваць іх у пад'ездзе. Любоў і пажаднасць – яны на твары і ў галаве, а не там, дзе лічаць цэнзары. Шыле тыцнуў (і працягвае тыкаць!) носам у тое, што свет – гэта вайна і хвароба, што ў людзей растуць валасы, ёсць геніталіі і іншыя «недахопы», якія прынята ўпарта адмаўляць. Шыле проста ўзяў і адкрыў усё. Ён сумленны і прагрэсіўны, у тым ліку ў дачыненні да сябе, бо ставіў эксперыменты і ў аўтапартрэтах.

Эган апярэдзіў свой час, але ён як дзіцё з рагаткай, якое паліць не разбіраючы. Ягоныя «стрэлы» разнастайныя, інтуітыўныя і экспрэсіўныя. Уся ягоная творчасць – суцэльны акт самаспалення: «Хіба дарослыя забыліся, якімі сапсаванымі, якімі сэксуальна заклапочанымі яны былі ў дзяцінстве?

Няўжо забыліся, якая жарсць гарэла ў іх і мучыла іх, калі яны былі дзецьмі? Я не забыўся, бо жудасна ад гэтага пакутаваў».

Панчохі на выявах аголеных дзяўчат выглядаюць як здзек. «Эган Шыле зноў у сваёй майстэрні. Там у яго заўсёды сядзяць дзве ці тры натуршчыцы <…>. Шыле не надаваў ім асаблівай увагі, а сядзеў ля мальберта нібы затаіўшыся тыгр. Раптам ён крычаў ‹Стоп!›, і натуршчыца мусіла застыць, а ён маляваў яе хуткімі штрыхамі. Калі трэба было, макаў пэндзаль у акварэльныя фарбы, дадаваў трохі чырвонага» [1].

У які момант агалення мы скажам «Стоп!», змушаючы цягнуць панчоху назад? У пэўны момант суддзя дэманстратыўна падпаліць малюнак Шыле, уважаючы яго парнаграфічным. Пазней, у турэмным дзенніку Эган напіша: «Я пафарбаваў свой ложак у камеры. Сярод брудна-шэрых коўдраў яркі апельсін, што прынесла мне Валі, – адзінае святло, якое ззяе ў гэтай прасторы. Маленькая каляровая плямка прынесла мне неверагодную карысць» [2].

Гэты апельсін, гэты агменьчык, таксама натхніў і мяне, калі ў Баранавіцкім СІЗА нам у камеру колера хлебнага мякішу на 17 дзяўчын прынеслі адзін апельсін. Ніхто не спяшаўся яго есці, толькі глядзелі ды нюхалі, а мы з сяброўкай яго намалявалі.

Фатаграфія – самы зразумелы спосаб паказаць, як ты разумееш сусвет. Шыле – геніяльны жывапісец, таму я не бачыла сэнсу змалёўваць з яго карцін. Гэту экспрэсію немагчыма паўтарыць. Я абрала жывапіс светам – стужкавую фатаграфію, што на вачах праяўляецца на паперы. Працэс адбываецца ў томным «чырвоным» пакоі. Паколькі мне не стае ведаў, я давяраю праяўку плёнак, гэты сакрэт, чалавеку, у якім упэўнена. Ён першым бачыць, што я зрабіла. Гэта вельмі інтымна. Але і працы Шыле вельмі інтымныя.

Чаму варта прыглядзецца да твораў Шыле смялей, не прыплюшчваючы вачэй? Бо нам увогуле трэба перастаць саромецца і баяцца. Шыле ствараў падчас Першай сусветнай вайны, калі, як сказаў аднойчы пісьменнік Віктар Марціновіч, салдацікі ў прыгожых мундзірах больш не ўкладалі ядрышка ў прыгожую пушачку; гэта была сапраўдная мясарубка, ўбачаная светам. Пасля вайны гэты свет яшчэ пакутаваў і ад эпідэміі гішпанкі, ад якой на шостым месяцы цяжарнасці памерла жонка Шыле. Праз тры дні не стала самога Эгана.

Калі ствараўся мой праект, увесь свет напаткала пандэмія COVID-19, а ў маёй краіне распачалася вайна супраць уласнага народа. Суцэльная чалавечая трагедыя. Пранікненне ў творчасць Шыле можа стаць хваравітым экзыстэнцыяльным вопытам, але калі здолееце яго перажыць, шмат што ў свеце стане больш зразумелым.

Выкарыстаная літаратура

[1] Илиес, Флориан. 1913. Что я на самом деле хотел сказать. Москва: Ad Marginem, 2019. 192 с.
[2] Roessler, Arthur. Egon Schiele en prison. La fosse aux ours, 2000. 64 p.













